# СВЯТА ПРЫНЁМАНСКАЙ КНІЖНАЙ СЯМ’І

**Літаратары Гродзеншчыны прынялі актыўны ўдзел у VIII Абласным фестывалі кнігі «Гарадзенскі ЛітФэст» у межах XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у Гродне.**

Лейтматывам дзеі стала тэматыка сям’і, сямейных каштоўнасцей і традыцый. 8 чэрвеня 2024 года на літаратурным падвораку фестывальнага Гродна каля Дома-музея Элізы Ажэшкі размясцілася вялікае мноства тэматычных пляцовак. На свята ў абласны цэнтр з’ехаліся дэлегацыі раённых бібліятэк, каб ярка і творча прадставіць свае кніжныя экспазіцыі, эксклюзіўныя літаратурна-асветніцкія, краязнаўчыя праекты.

Ні адзін фестываль нацыянальных культур у Гродне не абыходзіцца без міжнародных літаратурных мерапрыемстваў. Калі азірнуцца на дзясятак гадоў назад, можна ўзгадаць такія неаднаразова арганізаваныя Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ святы, як «Памежны трохкутнік» і «Кожны народ песняра свайго мае». Ідэйная аснова гэтых мерапрыемстваў простая і зразумелая кожнаму разумнаму чалавеку: мастацтва аб'ядноўвае людзей, мастацкае слова – універсальны сродак умацавання дружбы і добрасуседства паміж рознымі краінамі і народамі. Можна з упэўненасцю казаць, што беларуская літаратура, Саюз пісьменнікаў Беларусі робяць усё магчымае для ўстанаўлення і захавання міру і згоды ва ўсім свеце.

У апошнія гады пісьменнікаў Прынёмання запрашае «Гарадзенскі ЛітФэст». Свята мастацкага слова ладзіцца Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай

імя Я. Карскага (дырэктар Марына Эдвардаўна Ігнатовіч). Урачыстае адкрыццё сёлетняга фэста прысвяцілі 90-годдзю ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі. «*Ваша плённая асветніцкая дзейнасць, вялікая падзвіжніцкая праца па стварэнні разнапланавых твораў уплываюць на захаванне народнай беларускай культуры, непаўторнасці роднай мовы. Вы выхоўваеце сённяшніх чытачоў, узнімаючы тэмы маральнасці і духоўнасці, грамадзянскасці і патрыятызму, кахання, спачування і міласэрнасці, справядлівасці і гуманізму. Кожны з вас укладае ў свае творы частку сябе і сваёй душы, назапашаныя веды, жыццёвы і прафесійны вопыт. І гэта заслугоўвае глыбокай павагі і ўдзячнасці*», – гаворыцца ў віншавальным адрасе, уручаным пісьменніцкай арганізацыі вобласці ад калектыва Дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага». І сапраўды, натхнёныя запаветамі класікаў (Саюз пісьменнікаў БССР створаны менавіта ў гэтыя чэрвеньскія дні на першым з'ездзе літаратараў Рэспублікі ў 1934 годзе), верныя традыцыям адзінства і пераемнасці пакаленняў, літаратары Гродна і некалькіх раёнаў Гродзенскай вобласці выступілі дружнай сям'ёй аднадумцаў.




На «Гарадзенскім ЛітФэсце» СПБ атрымаў віншаванне з 90-годдзем свайго ўтварэння

У праграме «Гарадзенскага ЛітФэсту» сваю творчасць прадэманстравалі два дзясяткі прадстаўнікоў літаратурнай супольнасці Прынёмання рознага ўзросту, а таксама госці. Аўтарскімі вершамі ды песнямі парадаваў член СПБ, паэт, аўтар і выканаўца беларускіх песень Кастусь Цыбульскі (Мінск). Гродзенцам падарыў свае творы і кнігі беларускі паэт з Латвіі Станіслаў Валодзька (Даўгаўпілс). Творчай спадчыне Максіма Багдановіча прысвяціў

тэатралізаваны перфоманс прадстаўнік беларускай дыяспары Крыма, дэкламатар, асветнік Віталій Бартохаў (Алушта). Тэматычныя матывы выступоўцаў: грамадскае адзінства, любоў да Радзімы і мірнае неба над ёй, 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 90-годдзе ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі, 225-годдзе з дня нараджэння А. С. Пушкіна. Удзельнікам фестывалю былі ўручаны памятныя дыпломы. У аўтограф-зоне наведвальнікі свята мелі магчымасць набыць выдадзеныя намі кнігі з аўтарскімі подпісамі, асабіста пазнаёміцца і за кубкам гарбаты пагутарыць з майстрамі пяра.

Абласны фестываль кнігі пацвердзіў тэзіс аб тым, што мастацтва слова заўсёды было і будзе неад'емнай часткай культуры шматнацыянальнага беларускага грамадства. Нікога не пакінуўшы абыякавым, свята стала гісторыяй. Засталася наша справа, якая нягледзячы ні на што будзе працягвацца сумеснымі намаганнямі верных сяброў прынёманскай кніжнай сям'і.

## САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
### ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** VIII Абласны фестываль кнігі «Гарадзенскі ЛітФэст» і яго ўдзельнікі. Гістарычны цэнтр Гродна, 8 чэрвеня 2024 года.



На абласным фестывалі кнігі – чароўная атмасфера свята




Урачыстае адкрыццё абласнога фестывалю кнігі. Дырэктар ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага» Марына Эдвардаўна ІГНАТОВІЧ




Слова – старшыні ГрАА СПБ Людміле Антонаўне КЕБІЧ



Паэт Анатоль Апанасевіч прадставіў лірыку нашай калегі па СПБ, паэтэсы Марыі Шаўчонак



Член СПБ, паэтэса Тамара Мазур (Скідзель)



Член СПБ, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая




Патрыярх беларускай паэзіі Браніслаў Ермашкевіч






Член СПБ, гродзенская паэтэса
Людміла Шаўчэнка

Маладая паэтэса Вольга Алізар





Паэтэсы Галіна Васілеўская і Таццяна Абухоўская (Масты)



Член СПБ, паэтэса Наталля Цвірко (Шчучынскі раён)






ВСЕЙ СЕМЬЕЙ
В КНИЖНУЮ
ГАЛАКТИКУ






Выступае госць з Мінска, член СПБ, паэт, кампазітар, спявак Кастусь Цыбульскі





Паэтэса Святлана Глембоцкая
доўгі час узначальвала
Гродзенскае гарадское
літаратурнае аб’яднанне «Надзея»



Паэтэса Наталля Чакліна-Гарбачова





Выступаюць паэтэсы Соф'я Судзьіна і Вольга Пенькова («Надзея»)



Паэтэса Святлана Барнавалава (Гродна)



Паэтэса Алена Руж (Слонім) прадстаўляе Слонімскае раённае літаратурнае аб'яднанне імя Анатоля Іверса



Член СПБ, паэт Дзмітрый Радзівончык
прысвяціў сваё выступленне 225-годдзю
з дня нараджэння А. С. Пушкіна





Госць з Латвіі, член СПБ, беларускі паэт Станіслаў Валодзька (Даўгаўпілс)



Госць з Крыма, прадстаўнік беларускай дыяспары, грамадскі, культурны дзеяч Віталій Бартохаў (Алушта)


У сямейнага ачага






КРАЕВЕДЧЕСКАЯ
С ОБЛАСТНОЙ


чтением


Окрылённые
чтением




Библио-бар
Вкусная книга
ГУК "Вороновская
районная библиотека"
Любовный
коктейль




Фестывальныя сустрэчы. Паэт Дзмітрый Радзівончык (Гродна) з карацінскім паэтам Хізры Асадулаевым (Мінск) і беларускім паэтам, спеваком Кастусём Цыбульскім (Мінск)



Член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур (Скідзель) і кніжная брама



З дырэктарам Слонімскай раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа Тамарай Батыраўнай Гайдук *(у цэнтры)*



Фота
*Тамары Мазур,
Дзмітрыя
Радзівончыка і
Вольгі Алізар*